Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

Зоя
Мельнікава
Брэст

Уладзімір Караткевіч і творча-філасофскія пошукі „філалагічнага" пакалення

Uladzimir Karatkievich and aesthetic quests of the "philological" generation

Быць праўдзівым, добрым, чыстым, чалавекалюбівым. І вакол сябе… бачыць такіх самых братоў, а не кодла свядома-цёмнага і вераломнага быдла.

Праз дух разумнасці – да духу любові. Праз мудрасць і добрыя звычаі – да грамадства, дзе ўсім добра і, галоўнае, справядліва жыць.

У. Караткевіч, *Подзвіг Францыска Скарыны*

Прыход Уладзіміра Караткевіча ў літаратуру супаў з ідэалагічна і палітычна складаным часам позняга сталінізму і эпохай шасцідзясятніцтва. „Пацяпленне", хрушчоўская „адліга" – хоць непрацяглы, але плённы, значны перыяд, які аказаў рашаючы ўплыў на разняволенне ўсіх сфер грамадскага жыцця, у тым ліку і літаратуры. Ідэалагічная цэнзура на пэўны час паслабла, гэта разнявольвала літаратурна-мастацкую, пісьменніцкую свядомасць, што няўхільна вяло да пазітыўных змен у агульнакультурным, нацыянальна-духоўным жыцці Беларусі. Тое „пацяпленне" давала сілы парасткам творча-эстэтычнага ажыўлення, ідэйных, светапоглядна-філасофскіх пошукаў асабліва маладых творцаў. Поруч з пісьменнікамі-шасцідзесятнікамі Алесем Адамовічам, Янкам Брылём, Васілём Быкавым, Іванам Мележам, Іванам Шамякіным, Максімам Танкам, Андрэем Макаёнкам і іншымі ў літаратуру ўваходзіла новае – філалагічнае – пакаленне, таленавітымі і самабытнымі прадстаўнікамі якога сталі Уладзімір Караткевіч, Рыгор Барадулін, Анатоль Вярцінскі, Янка Сіпакоў, Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін і іншыя. Рашуча вызваляючыся з-пад улады культаўскіх рэгламентацый, літаратура набывала новыя якасці – непасрэдны зварот да ўзнаўлення гістарычнай праўды і народнага жыцця. І гэта зразумела: народ быў і заставаўся той сілай і той сферай, дзе заўсёды жыў дух даволі стойкай апазіцыі да хлусні і двурушнасці

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

дзяржаўных ідэалагічных структур, якія часта бессаромны блеф выдавалі за афіцыйную норму, за праўду для народа.

Кожная эпоха мае таленавітых творцаў, якія знаходзяць магчымасці пазбягаць, унікаць ідэалагічнага шырспажыву. Яны распрацоўваюць свае тэмы, дзе іх талент і сумленне не пакутуюць ад гвалту над жыццёвай праўдай. Толькі дзеля гэтага трэба быць мудрым, моцным, нясхібным – сапраўдным тытанам. Такім *тытанам і рыцарам беларускасці*, з яе асаблівай гісторыяй, філасофіяй і эстэтыкай, быў У. Караткевіч. Уласна, ён у літаратуры і мастацтве Беларусі 2-ой паловы XX стагоддзя адрадзіў арыстакратызм нацыі, сам быў носьбітам шляхетнай, арыстакратычнай беларускасці, і гэта засталося ў яго творах для ўзгадавання душы і розуму ўсё новых пакаленняў беларусаў.

Перачытанне Караткевіча, па трапным выказванні яго вялікага сябра літаратуразнаўцы і пісьменніка Алега Лойкі, – гэта „паглыбленне ў генетычныя асновы генія, у асобны мастацкі свет, ім створаны, у раскрыццё ім гісторыі роднага краю, народнага характару, народных асноў этыкі, барацьбы дабра і зла, супрацьстаяння высакародства і подласці”.[1] Але ж які інтэлектуальны, духоўны, душэўны дарунак дае кожнаму з нас гэтае перачытанне!… Бо, сапраўды, постаць Караткевіча і ўсё, створанае Караткевічам, – „глыба чалавечнасці, беларускасці, мастакоўнасці”.[2] І нам яшчэ доўга спасцігаць энергетыку яго думкі і слова.

Несумненна, што ў станаўленні Караткевіча як асобы і як пісьменніка вызначальнымі чыннікамі і этапамі былі: сям’я, час вучобы ў Кіеўскім універсітэце, кнігі, выкладчыкі, самаадукацыя, затым вучоба ў Маскве і зноў самадасканаленне, але, перадусім, праца – інтэлектуальная, духоўная і фізічная нястомнасць да самаахвярнасці.

Цікава пільней прыгледзецца да гэтага (храналагічна і геаграфічна „ўкраінскага”) часу, да жыцця і станаўлення ў ім маладога беларускага генія, да яго першага значнага празаічнага твора *У снягах драмае вясна*. Што яны ўяўляюць з вышыні новага стагоддзя ў гісторыка-эстэтычным вопыце беларускай літаратуры, у тым ліку – у ідэйна-філасофскім афармленні беларускага „шасцідзесятніцтва”?

„Прапісаць сучасніка ў гісторыі”: абранне творчага шляху

Па ўласным прызнанні Уладзіміра Караткевіча, Кіеў быў для яго першай, „неймаверна цікавай, гістарычнай і сучаснай”, самай захапляючай кнігай яго жыцця, „аж да таго часу, калі […] пачаў чытаць кнігу маёй роднай стараны, маёй зямлі […]”.[3]

[1] А. Лойка, *Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі*, [у:] *Уладзімір Караткевіч: вядомы і невядомы: зборнік эсэ, вершаў, прысвячэнняў*, уклад. А. Верабей, М. Мінзер, С. Панізнік, Мінск 2010, с. 16

[2] *Ibid.*, с. 16.

[3] У. Караткевіч, *Збор твораў*: у 8 т, т. 8, кн. 2: *З жыццяпісу, нарысы, эсэ, публіцыстыка, крытычныя творы, інтэрв’ю, летапіс жыцця і творчасці*, Мінск 1991, с. 119.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

Ён неаднойчы падкрэсліваў, што Кіеў і Украіна былі часткай яго душы. Яшчэ ў 1944-м годзе падлеткам ён жыў у вызваленым ад фашыстаў, але зруйнаваным Кіеве, дзе „пасля дзіўных выхадак лёсу […] мог зрабіцца ўкраінскай зямлёй".[4] У аповесці *Ліс-це каштанаў* аўтабіяграфічны герой Караткевіча расказвае, як ледзь не загінуў, бо руіны горада і яго ўскраіны, дзе штодзень бывалі падлеткі, хавалі ў сабе мноства небяспекі – неўзарваныя снарады, міны […] Трагічны лёс загінуць у мірны ўжо час ад „цацак вайны" напаткаў некаторых сяброў яго кіеўскага дзяцінства, пра што ён і піша ў названым вышэй творы.

З хвалюючай радасцю ехаў у 1949 годзе юнак Караткевіч зноў у Кіеў, на вучобу ва ўніверсітэт, дзе, вывучаючы філалогію, ён усур'ёз захапіўся гісторыяй (пазней пісьменнік пераканана сцвярджаў, што нельга быць філолагам і не быць гісторыкам). Гады вучобы ў Кіеўскім універсітэце далі беларускаму юнаку пачуццё „прыналежнасці да мінулага", дзіўнае адчуванне, што яно не знікла бясследна, „што ты жывеш унутры яго" і сваім жыццём працягваеш яго.[5] Малады Караткевіч быў перакананы, што менавіта тут, у старажытным намоленым продкамі горадзе, праз вучобу і кнігі ён глыбей зразумее ўсходнеславянскае гістарычнае мінулае, „чым яно ў кожнага народа падобнае і чым адметнае. І што было надзвычай важным для ўдумлівага і дапытлівага беларускага студэнта – у Кіеве „былі лепей упарадкаваныя бібліятэкі (асабліва аддзелы рэдкіх кніг і рукапісаў) і архівы. Акрамя таго, там ніхто не здзіўляўся, што я чытаю, напрыклад, Максіма Гарэцкага (быў 1949 год), усю літаратуру аб паўстанні 1863–1864 гадоў […]".[6] Ва ўніверсітэцкай бібліятэцы можна было вольна карыстацца перыёдыкай 20-х гадоў, былі даступныя старадрукі. Магчымасць вучыцца, спасцігаць, многа чытаць, дакранацца дапытлівым розумам да жывой гісторыі, да грамадска-культурнага жыцця тагачаснага Кіева і ўніверсітэта, вучоба ў таленавітых і сумленных выкладчыкаў, шырокае кола шчырых сяброў – гэта акрыляла, давала натхненне і перакананне, што ўсё задуманае спраўдзіцца, шчаслівa рэалізуецца ў блізкай будучыні.

Гады вучобы ва ўніверсітэце (закончыў у 1954 годзе) і жыццё ў Кіеве Караткевіч заўсёды называў шчаслівымі і згадваў іх праз гады з пачуццём „глыбокай пяшчоты і сораму". Пяшчотная ўдзячнасць была найперш да навукі, вучобы ў разумных, мудрых выкладчыкаў, да старых рукапісаў, якія ён меў магчымасць расчытваць, да кніг, кіеўскіх музеяў (кароткі час ён нават сам быў экскурсаводам у Кіеўскім Сафійскім саборы), да музыкі, дзяўчат, сяброў, свету паэзіі, увогуле літаратуры і гісторыі.

Прыкра было ўдумліваму студэнту Караткевічу, бо нярэдка даводзілася сустракацца „са звычайнай вульгарызацыяй навукі".[7] Дапытліваму юнаку хацелася

[4] *Ibid.*, с. 117.
[5] *Ibid.*, с. 118.
[6] *Ibid.*, с. 118–119.
[7] *Ibid.*, с. 430.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

„самому зразумець, *чаму і нашто*" (– выдзелена У. Караткевічам), а адказы на гэтыя пытанні часта даводзілася шукаць самастойна ў бібліятэцы.[8]

Кнігі, бібліятэка, іх свет, аўра, чытанне запаўнялі ўвесь вольны час, што было, па пазнейшым прызнанні пісьменніка, для яго „любоўнай, п'янай асалодай": „[…] там мне грымелі, шапацелі, спявалі Дастаеўскі і Сафокл, Шаўчэнка і ўсе старыя ўкраінскія, беларускія і іншыя гісторыкі. Там былі Катул, Антоніч, Рыльке, паэты Младой Польскі, Бунін, Ясенін і Грын […], невядомы мне да таго Норвід… Раскашуючы ў моры чалавечых думак і пачуццяў, я прымаў *сам* і адвяргаў *сам* [выдзелена намі – З. М.], давяраючыся толькі ўласнаму мозгу, сэрцу, сумленню, не кіруючыся нічыімі безапеляцыйнымі ўказаннямі".[9] Відавочна, аўтар меў на ўвазе пры гэтым і ідэалагічныя перасцярогі.

Акрамя кніг і чытання, на развіццё і станаўленне асобы будучага беларускага класіка вельмі ўплывалі, стымулюючы прагу пазнання гісторыі, свету, грамадства і сябе, мудрыя выкладчыкі, сапраўдныя вучоныя і настаўнікі. Некаторыя з іх тактоўна, часта канфідэнцыяльна, як роўны з роўным, хоць яны былі паважанага ўзросту, ненавязліва, з павагай нешта раілі пачытаць і асэнсаваць, „які келіх піць з […] разліўнога мора ідэй і тэорый". Так метафарычна і з вялікай удзячнасцю пісаў Караткевіч аб любімых выкладчыках – вядомым прафесары-літаратуразнаўцу А. І. Бялецкім, эрудыце А. А. Назарэўскім, С. І. Маславе, Л. А. Панамарэнка, некаторых іншых. Гэтыя вядомыя ўкраінскія вучоныя-гуманітарыі адорвалі дапытлівага беларускага студэнта шчырасцю, нават рызыкоўнай адкрытасцю, можа, большай, чым маглі дазволіць у сваіх кнігах.

Вартыя настаўнікі і сябры – гэта вялікі дарунак лёсу. І Караткевічу шчасціла ў гэтых адносінах. Выдатны ўкраінскі гісторык літаратуры А. І. Бялецкі, па сведчанні блізкага і добрага сябра пісьменніка Уладзіміра Калесніка, „быў любімым настаўнікам універсітэцкіх гадоў Караткевіча. Яму перадаў састарэлы прафесар сваю гістарычную бібліятэку, як запавет ці амулет місіянера".[10] А. І. Бялецкі быў вельмі аўтарытэтным даследчыкам літаратуры, прадстаўніком акадэмічнага літаратуразнаўства. Працы гэтага вучонага 50-х – 60-х гадоў сучаснае ўкраінскае літаратуразнаўства называе „падзвіжніцтвам ва ўмовах таталітарнай саветчыны".[11] А. І. Бялецкі ў ліку першых украінскіх савецкіх літаратараў рашуча абвяргаў догмы і рэгламентацыі вульгарнага марксісцкага літаратуразнаўства. У лекцыях і навуковых працах ён бліскуча абгрунтоўваў і даследаваў украінскую літаратуру як феномен эстэтыкі, раіў сваім калегам і вучням хутчэй пераадольваць астаткі дагматычнага стаўлення да марксізму. Прафесар прынцыпова патрабаваў ад калег разглядаць нацыянальную літаратуру ў сусветным кантэксце і як найпаўней ахопліваць літаратурны матэрыял, не мінаць „другарадных"

[8] *Ibid.*, с. 430.
[9] *Ibid.*, с. 121.
[10] У. Калеснік, *Усё чалавечае: Літ. партр., арт., нарысы*, Мінск 1993, с. 72.
[11] М. Наенко, *Історія українського літературознавства: Підручнік*, Київ 2003, с. 291.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

пісьменнікаў, асабліва ўважліва прыглядацца да творчасці тых, каго папракалі ў „нацыянальнай абмежаванасці".

Час вучобы Караткевіча ў Кіеўскім універсітэце быў апошнім, вельмі плённым перыядам навуковай дзейнасці і творчасці А. І. Бялецкага. Менавіта ў гэты час вучоны даваў сваім лепшым студэнтам, у ліку іх быў і будучы класік беларускай літаратуры, апошнія, але бліскучыя ўзоры разняволенага навукова-гістарычнага і філасофска-эстэтычнага мыслення. У літаратуразнаўстве пачатку 60-х гадоў XX ст. А. І. Бялецкі быў прыхільнікам і распрацоўшчыкам фармальна-эстэтычнай метадалогіі ў яе паяднанні з кампаратывістыкаю. Сваёй шырокай эрудыцыяй і талентам прафесар даваў прыклад малодшым калегам, быў кумірам для дапытлівых і ўдумлівых студэнтаў, захапляў іх літаратурай і гісторыяй.

Удзячны вучань Караткевіч прысвяціў прафесару А. І. Бяляцкаму адзін са сваіх праграмных вершаў першай кнігі паэзіі *Матчына душа – На паўстанках, засыпаных лісцем бярозавым*. Яго варта хоць часткова прывесці, каб спасцігнуць высокую сутнасць адносін вучня да настаўніка і, адпаведна, настаўніка да сваіх вучняў, яго веру ў свой працяг у іх.

На паўстанках, засыпаных лісцем бярозавым,
Дзе з пагардай цягнік двойчы ў дзень праляціць,
У простай хаце, пускаючы горкія слёзы,
У калысцы будучы Колас ляжыць.

Там, дзе хрыпла рыкаюць днём спякотным каровы,
Там, дзе ў прысаку хлопчыкі бульбу пякуць, –
Дваццаць першага веку галапузы Бетховен
Бацькаў кубак шпурляе, каб звон пачуць.
[…]
О, як трэба шукаць на шляхах чалавека,
Як любіць, берагчы, не крыўдзіць яго,
Каб пабачыць славу наступнага века
Ў сэрцы сціплага сына суседа свайго![12]

Радкі гучаць як прызнанне Настаўніку, які вучыў у мінулым, у гісторыі народаў шукаць вытокі філасофіі, эстэтыкі і духоўнасці. Як тут дзівосна і гарманічна паяднаны мінулае і будучае, нацыянальнае і агульнаславянскае, часовае і вечнае, рэальна зямное і ўзнёслае!.. І як хочацца схіліцца ў паклоне ўдзячнай пашаны перад украінскім прафесарам А. І. Бялецкім, які адарыў любоўю „сціплага сына" суседняга беларускага народа, бо сапраўды прадбачыў у ім беларускую „славу наступнага века"…

Пад уздзеяннем кніг, настаўнікаў і самой грамадскай атмасферы фарміруецца гістарызм мыслення, „псіхалогія гуманістычнай дапытлівасці" (У. Калеснік) маладога творцы-мысляра Караткевіча. Да славянскай і нацыянальнай гісторыі ён звярнуўся ў той час, калі інтэлектуальныя сілы грамадства перажывалі няста-

[12] У. Караткевіч, *Збор твораў*: у 8 т., т. 1: *Вершы, паэмы*, Мінск 1987, с. 41.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

чу гістарычнай праўды, якая, як хутка сфармуляваў яе значэнне для сябе Караткевіч, звязвае чалавека са сваім народам, яго мінулым і будучым, робіць жыццё асобы духоўна багатым, змястоўным, напоўненым патрыятычнымі каштоўнасцямі. Яшчэ студэнтам будучы пісьменнік быў перакананы: усведамленне сваёй прыналежнасці да гістарычнага лёсу народа падымае грамадзянскую годнасць чалавека.

Малады Караткевіч меў добрае ўяўленне, што такое сталінізм, бо сталінскія рэпрэсіі закранулі сям'ю (як і амаль сто год назад рэпрэсіі рускага самадзяржаўя закранулі дрэва яго продкаў па лініі маці). У 1939 годзе вярнуўся з турмы адзін з яго дзядзькоў, стары камуніст, які перад арыштам загадваў Камчацкім абласным аддзелам адукацыі. Дзядзька, як успамінаў пазней пісьменнік, нічога не ўтойваў ад тады яшчэ хлапчука-пляменніка. Але ў сакавіку 1953 года Караткевіч паехаў з сябрамі-студэнтамі на пахаванне Сталіна. Не таму, што смуткаваў, а каб бачыць усё ўласнымі вачамі. І ўбачыў вялікую даўку людзей. З сябрамі дапамагаў санітарам ратаваць пацярпелых. І пераканаўся яшчэ раз у антынароднасці і антычалавечнасці сталіншчыны нават пасля смерці „бацькі ўсіх народаў".

Прыход Караткевіча ў літаратуру быў імклівы, актыўны ў самых розных жанрах паэзіі і прозы: балады, лірычныя вершы, паэмы, апавяданні, аповесці, раманы, эсэ, нарысы, кінасцэнарыі, п'есы. Гэты бурны творчы ўзлёт адбываўся ў атмасферы палітызаванай савецкай крытыкі. Пра гэта трапна пісаў А. Лойка: „[…] пад бізунамі ідэйшчыны, пад аглабельшчынай […] На самым пачатку зазнаў Уладзімір Караткевіч разноснай крытыкі дагматыкаў роднай Оршы і цярпець не мог мінскіх герцовічаў, маскоўскіх чалмаевых".[13] На Беларусі гэта быў час татальнай русіфікацыі. Савецкая ідэалогія пазбаўляла беларусаў уласнай гісторыі. Малады пісьменнік ведаў ілжывасць, гнуснасць такога становішча. Пратэстуючы супраць дзяржаўнай хлусні, ён выразна сфармуляваў сваю асноўную творчую задачу – вярнуць беларускаму народу, нацыі ўласную гісторыю. Вось як ён сам пісаў аб гэтым: „Мне заўсёды краяла сэрца нейкая недарэчная прамежкавасць нашага народа (народ-межеумок, сказалі б расіяне). Заўсёды ён за кагосьці. І амаль ніколі не бывае сам за сябе. Чатырнаццаць гадоў як я зразумеў гэта, і ўсё гэта стала для мяне адной вечнай крыніцай пакут". Гэтыя радкі былі напісаны пісьменнікам у 1963 годзе.[14] Як бачым, імкненне вярнуць свайму народу гістарычную памяць, свядомасць і нацыянальную годнасць завалодала юнаком яшчэ да пачатку грамадскіх працэсаў дэмакратызацыі.

Караткевіч прадчуваў, што гэтая праца запатрабуе ад яго асабіста і ад тых, каму баліць за гістарычны лёс свайго народа, самаахвярнасці і нават тытанізму. Ён пісаў: „[…] трэба проста, годна і самотна рабіць сваю справу, не зважаючы ані на якія пляўкі, поўхі, страты. Відаць, пры такім становішчы будуць біць з усіх бакоў. Што ж, і гэта набытак […] Калі вытрымаем – значыць тытаны і не памрэм.

[13] А. Лойка, *Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі*, с. 16.
[14] *Ibid.*, с. 24.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

Калі […] не вытрымаем – туды нам і дарога, шэлег нам кошт і смецце нам магіла. І іншага мы не варты. І хай яны тады здыхаюць, такія ўладары думак і такі народ, не пераводзяць дарма хлеб. Таму што кожны купляе права на жыццё маральнай стойкасцю, веліччу душы, у якую ніхто не мае магчымасці запусціць лапы […].

Відаць, лёс любіць нас, калі даў нам такі гонар: быць адным супраць усіх […]".[15]

У гэтым выказванні пісьменніка засведчаны тытанізм яго светаразумення як беларускага грамадзяніна-патрыёта, яго імкненне да вырашэння ў творчасці нацыясцвярджальных задач пры разуменні ўжо трывалай інертнасці, душэўнай ляноты, абыякавасці народа да свайго лёсу. Уздым нацыянальнага гонару, самапавагі беларусаў – найперш гэта стала для яго творча-стратэгічнай задачай. І малады Караткевіч пачынае працаваць апантана, з вялікім напружаннем інтэлектуальных і фізічных сіл. Яшчэ ў 1957 годзе ён пісаў аб сваім імкненні напісаць сто тамоў аповесцей і раманаў „пра сто гадоў гісторыі Беларусі".[16]

Творы Караткевіча адразу павялі чытача да гістарычных падзей беларускай даўніны. Але яны загучалі надзвычай надзённа, актуальна, маніфестуючы права беларусаў, як і кожнага чалавека, да жыцця нацыянальна і эстэтычна самадастатковага, вольнага ад неабходнасці быць паслухмянымі да „праўды", якую прапаноўвалі „зверху". *Караткевічаўскі гістарызм вызначаўся* адрасаванасцю неасрэдна да сучаснікаў, дыялагізмам яго твораў з новым часам і стаў адным з важнейшых ідэйна-эстэтычных накірункаў беларускага літаратурнага шасцідзесятніцтва. Па-сутнасці Караткевіч прапанаваў нашай нацыянальнай літаратуры *ідэю яе філасофска-эстэтычнага абнаўлення праз гістарычную і патрыятычную тэматыку*. Канцэптуальнасць гістарызму сваіх твораў пісьменнік тлумачыў так: „На гістарычных сюжэтах я ствараю сваю матрыцу будучага. Калі ты ў пэўнай сітуацыі зрабіў так, а не інакш, то і праз сто, тысячу гадоў ты ў падобных абставінах зробіш у нечым падобны ўчынак. Кожны гістарычны сюжэт – гэта адкрытая размова з сучаснікам. А дзе яшчэ можна так поўна паказаць чалавека, што стаіць перад выбарам, кім яму быць, калі не на фоне гісторыі, вайны, экстрэмальных умоў, у якія трапляе гэты чалавек і праяўляецца ўвесь, да канца, да тых рыс характару, якія ён, можа, і сам не падазраваў у сабе".[17]

Феномен карткевічаўскага гістарызму трапна ахарактарызаваў У. Калеснік: „Жывучы душою ў гісторыі, […] Караткевіч дражніў вартаўнікоў ідэалагічнай чысціні праблемай набілітэту. Ён марыў адрадзіць арыстакратызм, элітарнасць у ахамелым на таталітарнай ураўнілаўцы грамадстве. Тады ніхто з пісьменнікаў не прызнаваўся, што ў яго бацькі была ў свой час моцная гаспадарка; апостальская манера прыбядняцца абавязвала ўсіх; самыя буйныя ўладнікі траслі лахманамі беднасці сваіх бацькоў і дзядоў […] Арыстакраты ў Караткевіча не абібокі,

[15] *Ibid.*, с. 24.

[16] *Ibid.*, с. 28.

[17] У. Караткевіч, *Любую справу рабіць хвацка: З У. Караткевічам гутарыла Р. Станкевіч*. „Літаратура і мастацтва" 1982, 3 снежня, с. 5–7.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

а рабачыя духу, соль зямлі, патрыёты, ахвярнікі, краса жыцця […] Нобілі ў яго разуменні – гэта людзі гонару”.[18] Адорваць сучасніка „радасным і балючым цяжарам гістарычнай прыналежнасці, прапісаць сучасніка ў гісторыі”, – так пазней сфармуляваў „генеральную творчую ўстаноўку” Караткевіча яго сябра ўдумлівы, праніклівы даследчык многіх караткевічаўскіх твораў У. Калеснік.[19]

У час, калі літаратура і мастацтва сцвярджалі класава-саслоўны антаганізм багатых і бедных, паноў-прыгнятальнікаў і бяспраўных сялян, Караткевіч пісаў аб дэмакратызме беларускай шляхты, яе паважлівым стаўленні да народа, аб імкненні перадавой шляхты ўдасканаліць грамадства, каб кожны чалавек, у тым ліку і селянін, быў вольным і мог сам вызначаць сваё жыццё і будучыню.

Яшчэ студэнтам Караткевіч задумаў напісаць некалькі аповесцей пра беларускую шляхту і хутка гэтую задуму здзейсніў, напісаўшы аповесці *Сівая легенда, Ладдзя роспачы, Цыганскі кароль*. Пісьменнік адкрываў сучаснікам невядомыя, і не толькі гераічныя, старонкі беларускай даўніны, абуджаў асабліва ў душах беларускай моладзі цікавасць да сваёй гісторыі, заахвочваў сучаснікаў пазнаваць мінулае, культуру, традыцыі продкаў, вывучаць родную мову.

І яшчэ: пісьменнік быў перакананы, што без мастацкай літаратуры на гістарычную тэму, і асабліва без *гістарычнага рамана, нацыя не можа сябе рэалізаваць*: „[…] няма нацыі без пачуцця гістарызму, без спакойнага гонару за сябе і проста самапавагі, без веры ў тое, што яна ёсць, яна непераходзячая, сталая вечная каштоўнасць вечнага чалавецтва […]”.[20] Нацыя, па перакананні Караткевіча, „павінна жыць дзейна і велічна, ведаючы сабе цану і ў дрэнным, і ў вялікім”.[21]

Нацыясцвярджальнай з’явай стаў раман Караткевіча *Каласы пад сярпом тваім*, які з вялікім захапленнем уласным мінулым упершыню змаглі прачытаць беларускія чытачы ў 1968 годзе. Больш за чатыры дзесяцігоддзі хвалюе гэты твор усё новыя пакаленні беларусаў. Раман стаў хрэстаматыйным для вучнёўскай моладзі, ён утрымлівае магутны асветны і выхаваўчы патэнцыял. Караткевіч прызнаваўся, што задума напісаць твор аб паўстанні і паўстанцах 1863 года з’явілася яшчэ ў часы студэнцтва. „Замест таго, каб хадзіць на лекцыі, сядзеў у бібліятэцы над старымі кнігамі. Паступова перад маімі вачыма паўставалі прываблівыя постаці маіх продкаў – свабодалюбівых людзей. І сярод іх – паўстанцы 1863 года, якія не шкадавалі жыцця «за нашу і вашу свабоду»”.[22]

Да мастацкага ўзнаўлення тых важных, трагічных і гераічных падзей Караткевіча падштурхоўвала і сямейнае паданне аб расстраляным продку-паўстанцы. Ад задумы да здзяйснення прайшло каля дваццаці год. З гэтым творам і яго ге-

[18] У. Калеснік, *Усё чалавечае*, с. 104.
[19] *Ibid.*, с. 115.
[20] Цыт. па: А. Верабей, *Абуджаная памяць: Нарыс жыцця і творч. У. Караткевіча*, Мінск 1997, с. 71
[21] *Ibid.*, с. 71–72.
[22] А. Русецкі, *Уладзімір Караткевіч: Праз гісторыю ў сучаснасць: Нататкі літ. творчасці*, Мінск 1991, с. 76.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

роямі Караткевіч і сёння прыходзіць да падлеткаў у кожную беларускую школу, у кожную сям'ю.

Сёння ўжо страцілі цікавасць, застаўшыся толькі фактамі літаратурна-крытычнага жыцця, папрокі, павучанні многіх апанентаў і проста несумленных, прыдзірлівых крытыкаў аўтару гэтага выдатнага рамана. Але твор надзвычай „жывы", як і ўсё, напісанае Караткевічам, і раман *Каласы пад сярпом тваім* уступае ў дыялог з новым часам, з усё новымі пакаленнямі праніклівых даследчыкаў.

Большасць літаратуразнаўцаў называюць гэты раман сацыяльна-гістарычным, што, безумоўна, справядліва. Аднак шматэмнасць, філасафізм, універсальнасць праблематыкі твора гэтым не вычэрпваюцца. Гісторыка-асветны, маральна-патрыятычны імператыў вызначае канцэптуальную сутнасць Караткевічавага гістарызму, што асабліва ярка засведчана ў гэтым творы.

З філасофскай глыбінёй, тонкім адчуваннем аўтарскай задумы і мастацкага свету гэтага поліфанічнага твора прачытала раман *Каласы пад сярпом тваім* даследчыца Галіна Ішчанка ўжо ў пачатку новага, XX1 стагоддзя. Яна дадае істотнае ўдакладненне да ўжо існуючых жанравых характарыстык гэтага твора, называючы яго, як, дарэчы, і Ала Сямёнава, „*раманам выхавання*», слушна мяркуючы, што адрасатам многіх твораў Караткевіча з'яўляецца менавіта моладзь: „Аўтар *Каласоў пад сярпом тваім* разумеў, што менавіта ў юнацтве ў чалавеку выспявае база душы, унутраная сіла, якая становіцца ідэяй жыцця, ці, інакш кажучы, яго канцэпцыяй… У ўзросце 16–18 гадоў пытанне пра сэнс жыцця паўстае перад чалавекам з усёй вастрынёй, патрабуючы індывідуальнага вырашэння […] На старонках рамана У. Караткевіч змог падзяліцца духоўным вопытам уласнай маладосці, увасобіць у мастацкіх вобразах з вышыні пражытых гадоў уласную мадэль свету і чалавека, адрасаваць яе тым, хто шукае сябе і сваё прызначэнне на зямлі […].

Ён не проста пераносіў юнакоў, патэнцыяльных сваіх чытачоў, з задушлівай рэчаіснасці 60-х гадоў XX стагоддзя ў мінулае, даючы свежы струмень паветра, а паказваў такіх герояў, якія ўмелі супрацьстаяць неспрыяльнай грамадскай атмасферы, застаючыся духоўна прыгожымі і багатымі асобамі".[23]

Пісьменнік быў перакананы, што існуе толькі адзін спосаб фарміравання нацыянальна годнай і культурнай асобы – „выхаванне ў чалавеку гордасці за свой народ і яго дзеянні ў гісторыі. І – у сучасным – праца, часам непасільная, па асвеце моладзі, па абуджэнні ў ёй глыбокіх ведаў аб сваіх людзях і сваім краі. Калі ўсе будуць працаваць над гэтым на грані сваіх магчымасцей – грамадства здолее ўсё".[24]

І сёння, на другім дзесяцігоддзі XXI стагоддзя, словы пісьменніка і яго клопат аб патрыятычным выхаванні, аб тым, каб кожны з яго суайчынікаў быў менавіта нацыянальна годнай і культурнай асобай, застаюцца надзвычай актуальнымі для сучаснага беларускага грамадства.

[23] Г. Ішчанка, *Каласы адродзяцца ў зерні,* Брэст 2002, с. 22–23.

[24] У. Караткевіч, *Збор твораў*: у 8 т, т. 8, кн. 2, с. 427.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

Маніфест філалагічнага пакалення: аповесць У. Караткевіча *У снягах драмае вясна*

Станаўленне, грамадзянскае пасталенне маладога чалавека, юнака-студэнта ў культаўскі час выдатна перададзена ў самай першай аповесці Караткевіча –*У снягах драмае вясна*, якая была закончана ў 1957 годзе, у час менавіта дэмакратызацыі, „адлігі".

Неабходна спыніцца на вызначальным светапоглядна-творчым уплыве на станаўленне Караткевіча ўкраінскага грамадска-культурнага жыцця другой паловы 50-х гадоў, што, дарэчы, выразна ўвасоблена і ў гэтым творы: у перакананым дэмакратызме поглядаў галоўнага героя, у яго рашучасці змагацца з хлуснёй і цынізмам ва ўсіх праявах, у вобразах тагачаснай моладзі, у атмасферы дыскусійнасці і прынцыповых ідэалагічных спрэчак апанентаў у студэнцкім асяроддзі.

Украінскае шасцідзесятніцтва было больш масавым і актыўным у выяўленні маральнай апазіцыі савецкаму таталітарызму, чым на Беларусі. Найважнейшым ідэйным момантам украінскага шасцідзесятніцтва было выяўленне і сцвярджэнне нацыянальнай самасвядомасці. У гэты час на Ўкраіне разгарнуўся шырокі сацыякультурны рух, у цэнтры якога аказаліся гуманітарыі, асабліва пісьменнікі, вучоныя і адукаваная творчая моладзь. Літаратура прыкметна ўплывала на грамадскае жыццё. Хвалі творчай свабоды літаральна „накрылі" Украіну. У 1953 г. выйшла кніга Дзмітра Паўлычкі *Любоў і нянавісць*, у 1957 г. – Ліны Кастэнка *Промні зямлі*, якія ўтрымлівалі пафас барацьбы за сапраўдныя нацыянальна-культурныя каштоўнасці, за вызваленне ўкраінскай духоўнасці.

Маладыя таленавітыя пісьменнікі Мікола Вінграноўскі, Віталь Кароціч, Барыс Алейнік, Васіль Сіманенка, Іван Драч, Фёдар Цюцюннік, Іван Дзюба зрабілі сапраўдную рэвалюцыю не толькі ў літаратуры, а аказвалі ўплыў на ўсе сферы грамадска-культурнага жыцця. Кожны іх твор меў жывы рэзананс у асяроддзі моладзі, студэнтаў. Новая генерацыя ўкраінскіх творцаў прамаўляла сваё шчырае, патрыятычнае і вольналюбівае, а не „сацрэалістычнае" слова. Літаратурныя крытыкі І. Святлічны, І. Дзюба і інш. рашуча выступалі супраць засілля ў мастацкай творчасці ідэалогіі, якая ўсё яшчэ патрабавала пісаць пра вытворчасць, сельскую гаспадарку і на „партыйна-ленінскія" тэмы.

Вялікі грамадскі рэзананс і масавы ўздым пачуцця нацыянальнай годнасці мела кніга І. Дзюбы *Інтэрнацыяналізм ці русіфікацыя?*, а таксама перавыданні рэпрэсаваных у 20–30-я гады ўкраінскіх пісьменнікаў. Патрыятызм моладзі ўздымалі творы Вінічэнка *Сумленнасць з сабою*, *Запавет бацькоў*, *Раўнавага*. Літаратары, мастакі збіраліся на кіеўскіх кватэрах, спрачаліся, марылі… Важным цэнтрам грамадскага і культурна-асветнага жыцця ў тагачасным Кіеве стаў клуб творчай моладзі „Сучаснік". Яго сябры – пераважна студэнты, маладыя творцы – адраджалі народныя святы, адшуквалі месцы масавых расстрэлаў ахвяр рэпрэсій, наладжвалі вечары памяці нацыянальных геніяў – Тараса Шаўчэнкі, Івана Франка, Лесі Украінкі… У перыёдыцы разгарнуліся зацікаўленыя дыс-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

кусіі па праблемах традыцый і наватарства, бацькоў і дзяцей. Аб неабходнасці сцвярджэння сапраўдных культурных каштоўнасцей, нацыянальнай незалежнасці і чалавечай годнасці пісалі ўкраінскія гісторыкі і пісьменнікі. Украінская дэмакратычная інтэлігенцыя адкрыта пратэставала супраць уводу ў Будапешт у 1956 г. савецкіх танкаў. Гэта падзея стала нагодай для новых, смелых дыскусій аб гістарычным выбары, этычнай свабодзе. У літаратуры паўставала новая эстэтычная катэгорыя „асоба", „індывідуальнасць", якая ўспрымалася антыподам масаваму герою – „савецкаму народу", „працоўным масам".

У цэнтры такога інтэнсіўнага, напоўненага прагай духоўна-гуманістычнага ачышчэння, пазнання гістарычнай праўды, перакананасці ў справядлівай дэмакратычнай будучыні знаходзіўся малады Караткевіч. Нездарма ж яго ледзь не выключылі з універсітэта за „ўкраінскі нацыяналізм". Ужо тады ён меў магчымасць чытаць кнігі і публікацыі акадэміка Андрэя Сахарава, Івана Дзюбы, некаторых іншых, якія „самвыдатам" распаўсюджваліся сярод украінскай інтэлігенцыі. Вялікі ўплыў на Караткевіча аказвалі і польскія кнігі, часопісы і газеты, якія без перашкод з'яўляліся на Ўкраіне, і асабліва раманы Генрыка Сянкевіча *Агнём і мячом*, *Камо грядеши*, творы Станіслава Лема з непрыхаваным антысавецкім зместам. З гэтых і многіх іншых вартых кніг вырасталі адукаванасць, інтэлектуальнасць, дэмакратызм і гуманізм Караткевіча і ўсяго філалагічнага пакалення, якое ўзрастала на глебе шасцідзесятніцтва. Такі багаты духоўны досвед меў малады аўтар аповесці *У снягах драмае вясна*.

Для нас застаецца загадкай, чаму Караткевіч як бы сам забыў гэты твор, не ўключаў ні ў якія выданні і нават не згадваў пра аповесць. Адам Мальдзіс – першы і аўтарэтэтны інтэрпрэтатар „першынца" – перакананы, што „першынцы не забываюцца". Ён выказвае наконт гэтага наступнае меркаванне:

„Мне здаецца, што прычына тоіцца ў неадпаведнасці таго часу, калі пісалася аповесць, і тых часоў, што наступілі пазней.

У канцы аповесці пазначана: «Май 1957 г., Орша». Гэта сведчыць пра тое, што яна пісалася на хвалі абнаўлення, якое пачалося пасля XX з'езда нашай партыі. Пісалася, калі пачалася «вясна», што «драмала» ў ранейшых «снягах» (прыгадаем, што асноўныя падзеі аповесці адбываюцца крыху раней – у 1952 годзе). Як і сам пісьменнік, яго герой Уладзіслаў Берасневіч усім шчырым сэрцам і адкрытай душой вітаў гэту «вясну», гэтае доўгачаканае абнаўленне…

Аднак мы ведаем, што тая першая «вясна» была непрацяглай. Пасля яе, гаворачы словамі аповесці, зноў пачалі выпадаць «снягі», зноў наступілі «марозныя ночы»… Уладзімір Караткевіч усё гэта балюча, абвострана перажываў. Ён поўніўся прадчуваннем сапраўднай вясны.

І не згадваў свайго першынца, не шукаў яго".[25]

[25] А. Мальдзіс, „*Першынец*" *Уладзіміра Караткевіча*, [у:] У. Караткевіч, *У снягах драмае вясна: Аповесць*. Мінск 1989, с. 122–123.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

Па меркаваннях С. Андраюка, А. Вераб'я, Г. Ішчанка, аўтарскія канцэптуальнасць і філасафізм першай аповесці былі поўна рэалізаваны Караткевічам у рамане *Каласы пад сярпом тваім*, таму, відаць, пісьменнік і не лічыў патрэбным друкаваць, асобна выдаваць яе. Прывядзем пераканаўчыя, на наш погляд, аргументы Г. Ішчанка:

„І ў ранняй аповесці *У снягах драмае вясна*, і ў адным са сваіх вяршынных твораў *Каласы пад сярпом тваім*… пісьменнік засяроджвае ўвагу на карэнных недахопах савецкай педагогікі і ўсёй ідэалагічнай сістэмы выхавання моладзі, якая шмат гадоў малявала „светлую будучыню" як нешта аўтаматычна гарантаванае ўсім і кожнаму. Як і ў аповесці, так і ў рамане купка чыстых сумленных юнакоў супрацьстаіць народжанай часам ідэалагічнай і выхавальнай сістэме і яе прадукту – прыстасаванцам і кар'ерыстам […].

І сябры Уладзіслава Берасневіча, і сябры Алеся Загорскага імкнуцца да самастойнасці думкі, адстойваюць права на свабоду выбару. Юнакам 50-х гадоў XX ст., як і іх аднагодкам з XIX ст., характэрна дапытлівасць і смеласць думкі.

Герояў ранняй аповесці і рамана яднае чыстае, высакароднае стаўленне да жанчыны, здольнасць моцна кахаць. Паказальна, што і дзяўчаты, якімі захапляліся Уладзіслаў і Алесь, таксама падобны знешне і ўнутрана, аб гэтым сведчыць параўнанне партрэтаў і паводзін Алёнкі і Майкі. Каханне Берасневіча да Алёнкі, Алеся – да Майкі праходзіць праз аналагічныя выпрабаванні: дзяўчаты засумняваліся ў маральнай чысціні сваіх абраннікаў […] І толькі ростань, душэўныя пакуты даюць зразумець і Алёнцы, і Майцы, што кахаць – значыць, у першую чаргу, думаць пра свайго каханага, а не пра сябе […]".[26]

Тым не менш, аповесць *У снягах драмае вясна* з'яўляецца арыгінальным, самастойным творам, які павінен заняць адпаведнае важнае месца ў гісторыі беларускага літаратурнага працэсу 2-ой паловы XX стагоддзя. Важнае і асобнае ўжо таму, што ў нашай літаратуры таго ды і пазнейшага часу не было твораў, дзе ў цэнтры аўтарскай увагі – станаўленне, грамадзянскае пасталенне маладога пакалення ў культаўскі час і ў перыяд ранняга постсталінізму. Мы далучаемся да аб'ектыўнай, сутнаснай ацэнкі аповесці А. Мальдзісам: „Гэта мужная і шчырая споведзь юнака, што сумленна ўваходзіць у сапраўднае жыццё. І напісаны твор вопытнай, спрактыкаванай рукой".[27] Неабходна засяродзіцца на гэтым арыгінальным і, відавочна, адным з лепшых празаічных твораў нашай літаратуры таго часу, каб выразней уявіць філасофска-духоўныя, ідэалагічныя пошукі беларускага „шасцідзесятніцтва", якія, па нашых назіраннях, тут пераканаўча дэкларуе малады пісьменнік, што дае падставы лічыць гэты твор мастацкім маніфестам „філалагічнага пакалення" ў нацыянальнай літаратуры.

Як ужо зазначалі даследчыкі творчасці Караткевіча, аўтабіяграфізм галоўнага героя аповесці *У снягах драмае вясна* Уладзіслава Берасневіча не выклікае

[26] Г. Ішчанка, *Каласы адродзяцца ў зерні,* с. 18–19.

[27] У кн.: У. Караткевіч, *У снягах драмае вясна*, с. 122.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

сумнення. Дададзім, што гэта не столькі біяграфізм знешніх супадзенняў (часу студэнцтва, абставін, мінулага жыцця). Тут, дарэчы, ёсць і адрозненні. Для нас асабліва важна, што аповесць уяўляе ўнікальны спавядальнай шчырасцю і праўдзівасцю твор аб духоўным станаўленні і грамадзянскім супрацьстаянні ўсяго „філалагічнага пакалення" таталітарна-савецкім светапоглядна-ідэалагічным выхаваўчым рэгламнтацыям.

Усім, хто цікавіўся асобай самога Караткевіча, вядомы яго маральна-этычны максімалізм, глыбокая беларускасць і сапраўдны інтэрнацыяналізм, яго дасведчанасць у музыцы, жывапісе, архітэктуры, культуры не толькі свайго, але і іншых народаў. І менавіта па ўнутранай, духоўнай сутнасці супадаюць аўтар і герой гэтага твора.Уладзіслаў Берасневіч, галоўны герой аповесці, паслядоўна абараняе *сваю праўду* і ўласныя прынцыпы адносін са светам, з людзьмі, з таварышамі па вучобе, з выкладчыкамі ўніверсітэта, з каханай. Гэтая праўда здабыта героем упартай і ўдумлівай самаадукацыяй, вучобай у разумных выкладчыкаў. Юнак настойліва і актыўна шукае сябе, выяўляе ў розных сферах – у грамадскай працы, у вучобе, у сяброўстве і каханні, у марах аб будучыні. Уладзіслаў аналітычна ацэньвае людзей, жыццё, засяроджана разважае аб падзеях і зменах, што адбываюцца ў краіне.

Пісьменніцкая ўвага засяроджана найперш на ўнутраным абліччы героя, таму ён зразумелы чытачу думкамі, паводзінамі, сваімі парываннямі да будучага самастойнага, сумленнага жыцця дзеля выхавання і асветы людзей: ён – будучы настаўнік-гуманітарый. Берасневіч горача вітае грамадскія змены, ён перакананы, што наступае яго час, час усіх сумленных, шчырых, разумных і працавітых людзей. Змены ў дзяржаве ўпэўнівалі сталага па адносінах да жыцця юнака, „што робіцца яго справа, і сама дзяржава робіцца ўсё больш і больш роднай яму, без ранейшых непаразуменняў […] Стала спакайней на сэрцы".[28]

Праз свайго героя, прадстаўніка адукаванага філалагічнага пакалення, аўтар перадае важныя перакананні: памяць пра падзеі мінулага і выдатных людзей, веданне духоўнай спадчыны, шанаванне культуры продкаў – гэта светапоглядна-маральная база кожнага адукаванага чалавека і грамадзяніна. Таму светапогляд караткевічаўскага героя-сучасніка моцна ўгрунтаваны яго гістарычным досведам аб роднай Беларусі, мове народа, культуры, фальклоры, а таксама аб гісторыі, культурных традыцыях іншых краін і народаў, да якіх ён ставіцца з шанаваннем. Героя нельга папракнуць у „бязродным касмапалітызме" ці „нацыяналізме", а такія ідэалагічныя ацэначныя штампы шчодра раздаваліся ахоўнікамі сацрэалізму ў той час.

Сюжэтныя падзеі аповесці пачынаюцца ў лютым 1952 года і заканчваюцца праз чатыры гады. Жыццёвую гісторыю Берасневіча варта назваць гісторыяй юнацтва і станаўлення філалагічнага пакалення, што вырастала на ідэйным грунце „шасцідзесятніцтва". Караткевіч удала выбраў апавядальную стратэгію:

[28] У. Караткевіч, *У снягах драмае вясна*, с. 123.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

аповед падзей прапанаваны ад трэцяй асобы, але ў многіх мясцінах, непрыкметна для чытача, апавядальная плынь перадаецца „я”-герою – Берасневічу. Так, у першых абзацах аповесці аўтар з сімпатыяй і іранічнай цеплынёй прадстаўляе свайго героя па маладосці чалавекам легкадумным і трошкі самаўпэўненым, які верыў, што жыццё і свет існуюць толькі для яго: „Было яму дваццаць два гады, вучыўся ён на чацвертым курсе ўніверсітэта, ніколі яшчэ не кахаў па-сапраўднаму, быў моцны, глытаў кнігі, жыў амаль толькі на адну стыпендыю […]”.[29]

Аўтар адразу вылучае арыгінальнасць, самастойнасць, дапытлівасць і мэтанакіраванасць героя: ён многае хацеў зрабіць у сваім жыцці, шкадаваў марна страчаных дзён, да сваёй адукацыі, і асабліва будучыні, ён ставіўся з грунтоўнай адказнасцю. Таму на некаторыя, не цікавыя для яго ўніверсітэцкія заняткі, Берасневіч дазваляў сабе не хадзіць, мяркуючы, што не варта губляць час. Калі выкладчыкі чытаюць нудна, лепш аб гэтым прачытаць некалькі кніг і ўдумліва, самастойна, без навязаных чужых думак іх асэнсаваць. Але ён абавязкова наведваў лекцыі таленавітых выкладчыкаў і тыя заняткі, дзе мог пабачць каханую дзяўчыну – Алёнку. Многа часу ён праводзіў у бібліятэцы або „проста ляжаў на ложку і пісаў вершы”.[30]

Так перад чытачом паступова складваецца тыповы і абаяльны вобраз дапытлівага, творча адоранага маладога чалавека, студэнта-філолага, які, да таго ж, апантана вывучае гісторыю, цікавіцца мінулым славянства і іншых народаў. Напоўненасць студэнцкага жыцця, аднак, часам азмрочвалася непрыемнымі, нетактоўнымі заўвагамі камсамольскага сакратара факультэта Петруся Маркіча. Той навязліва лез ва ўсе, нават асабістыя справы камсамольцаў і найперш Берасневіча, які, на думку Маркіча, дазваляў сабе многа незалежнасці і самастойнасці.

Па-сутнасці, канфлікт, спачатку прыхаваны, між гэтымі героямі, а потым і адкрытае супрацьстаянне між імі (эпізод камсамольскага сходу) і складае сюжэтна-ідэйную аснову аповесці. Сакратар камсамольскага бюро меў сваіх актывістаў-памагатых, якія даносілі Маркічу, хто і якія ўласныя меркаванні, адрозныя ад прынятых партыйных, камсамольскіх, дазваляў сабе выказваць. У асобе Уладзіслава сакратар бачыў не проста апанента, а канкурэнта на сапраўднае лідэрства ў студэнцкім калектыве. Але заканчваўся „час Маркіча”, калі чалавек быў бездапаможны перад ідэалагічнымі абвінавачваннямі і прыдзіркамі; моладзь самастойна шукала адказы на вострыя пытанні жыцця і часу, смела зазірала ў заўтрашні дзень, вольны ад дэмагогаў і кантралёраў чалавечай душы і светапогляду. Вось гэты пераходны, драматычны час вызвалення ад „маркічаўшчыны”, час дэмакратызацыі, які пачынаўся ў асяроддзі адукаваных людзей, пераканаўча адлюстраваны Караткевічам.

Маркіч – тып маладога і небяспечнага кар’ерыста-прыстасаванца. Такія патрэбны кожнай таталітарнай сістэме, бо ўмеюць запалохаць, шантажыра-

[29] *Ibid.*, с. 4.
[30] *Ibid.*, с. 14.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

ць, белае выдаць за чорнае, знаходзіць ідэалагічную дыверсію ў шчырых, зацікаўленых спрэчках, выказваннях адкрытых і прынцыповых людзей. Маркіч маніпулюе паводзінамі бязвольных студэнтаў. Пэўны час па яго заданні зямляк і сусед Берасневіча па пакоі Рыгор Сяляўка даносіць „камсамольскаму важаку" ўсё пра Уладзіслава. Заклапочаныя, прынцыповыя меркаванні Берасневіча аб тым, што „таленавітай моладзі патрэбен прастор, патрэбна, каб жыццё было цікавым. А ў нас гэтага часта няма […] Маральных прынцыпаў мы таксама амаль не прышчэпліваем або прышчэпліваем дрэнна […]". Маркіч ацэньвае з пільнай ухмылкай: Што ж, выходзіць, выхаванне наша дрэннае? […] Глядзі, хлопча, нешта ты мудрагеліш […]".[31]

Асоба маладога гуманітарыя і паэта Берасневіча сталее і выяўляецца ў студэнцкіх дыскусіях, спрэчках з апанентамі тыпу Маркіча і выкладчыка Холадава. Здаровую крытычнасць, удумлівасць у адносінах да жыцця і грамадства яму прышчапіў у сям'і бацька, які расказваў аб станаўленні савецкай дзяржавы і многае з сучаснасці крытыкаваў, кажучы, што гэта „не па-ленінску". Таму Берасневіч намагаўся даваць уласныя ацэнкі людзям і падзеям, у тым ліку і пачутаму ў аўдыторыі, вычытанаму ў кнігах. Для яго катэгарычна непрымальная жыццёвая беспрынцыпнасць Рыгора Сяляўкі, які ствараў уражанне слабога, бездапаможнага чалавека, што „вечна спіць, вечна не мае сваёй думкі, вечна толькі й думае, каб прыляпіцца да кагосьці мацнейшага і гаварыць яго словамі, жыць ягонай адказнасцю. І заўсёды „так, як усе".[32] Аднак пасля таго, як Берасневіч выратаваў жыццё Рыгору на будоўлі стадыёна, пасля вераломных і цынічных намаганняў Маркіча абылгаць, ідэалагічна абвінаваціць Уладзіслава, Сяляўка набыў уласны голас і пазіцыю. Несумненна, такое маральнае і грамадзянскае пасталенне слабога героя адбываецца пад уплывам Берасневіча.

Многімі старонкамі аповесць успрымаецца як ідэалагічная спрэчка маладога героя з учарашнім днём, які ідэйна і палітычна абмяжоўваў правы і магчымасці асобы на самарэалізацыю, на гарманізацыю асабістага і грамадскага ў духоўным свеце, у інтэлектуальных і філасофска-быційных пошуках. Маладыя героі-студэнты Караткевіча – носьбіты новага светаадчування, што і дэкларуе найперш галоўны герой, асаблівы крытычна ставячыся да састарэлага зместу ўніверсітэцкіх грамадазнаўчых дысцыплін.

Уладзіслаў, выражаючы пазіцыю маладых, адукаваных інтэлектуалаў філалагічнага пакалення, з абурэннем разважае: „мы здаровыя, моцныя людзі, *зусім новыя людзі* […] [выдзелена намі – З. М.] Нашто нас гэтак трымаць за руку, даюць кнігі «адсюль – дасюль», каб, крый божа, не сапсаваліся, не адкусілі мы ад гэтага Бадлера, ад Андрэева. Толькі і чуеш: «Рэакцыянер Дастаеўскі», «буржуа Гамсун». Голае слова мала важыць. *Трэба быць моцным*… Нешта тут не дадумалі, гэта памылка, і тут *адсутнічае давер да нашага чалавека"* (выдзелена намі

[31] *Ibid.*, с. 17–19.
[32] *Ibid.*, с. 18.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

– З. М.).[33] „Адсутнасць даверу да чалавека" – гэта і ёсць імкненне адпаведных партыйна-ідэалагічных структур навязваць маладым адукаваным людзям учарашнія ідэйныя і аксіялагічныя стандарты.

„Новыя людзі", студэнты ўслых выказваюць свае сумненні аб злачыннасці сталінскіх рэпрэсій. Берасневіч з яго тыпова савецкай і нават гераічнай біяграфіяй (бацька ў партыі з 1905 года, а дзядзька – яшчэ раней; цяжка працаваў з маленства; быў партызанскім сувязным у час вайны, а пасля – на камсамольскай працы ў Заходняй Беларусі) як чалавек удумлівы сумняваецца ў судовых працэсах „эканамічнай контррэвалюцыі", у дзікунскіх абвінавачваннях сталінскім рэжымам жыдоў, інгушоў. Пры гэтым малады філолаг з зайздроснай дасведчанасцю прыводзіць выказванне Маркса „Адносіны да яўрэяў – пробны камень цывілізацыі". Ён лагічна і занепакоена разважае: „Сёння, выходзіць, іх, а заўтра мяне, беларуса. […] Зрабіў чалавек няпэўны крок […] заблытаўся трошкі. І тут адразу бюро, пярун з яснага неба, папярэджанне, выключэнне […] А аступаюцца часцей за ўсё людзі разумныя […] Значыцца, разумным і таленавітым перш за ўсё па галаве трапляе з рук такіх, як Маркіч".[34] Так выразна гучыць Караткевічаў маніфест абароны „разумных і таленавітых" ад партыйна-рэпрэсіўных мер „перавыхавання".

Праз дыскусіі ў студэнцкай сябрыне і пытанні, якія задаюць маладыя героі сабе, грамадству, свайму часу, Караткевіч перадае атмасферу паступовай дэмакрытызацыі і грамадскага абнаўлення („марцавых санетаў"), у якіх фарміраваліся, гартаваліся жыццёвыя прынцыпы і светапогляд філалагічнага пакалення. Праз гэтыя дыскусіі малады пісьменнік, прадстаўнік гэтага пакалення, дае ацэнку ахоўнікам таталітарнага рэжыму, дагматыкам-ідэолагам, якія намагаліся стрымаць грамадскі прагрэс, разняволенне людскіх душ. Ахоўнікам рэжыму патрэбна, каб людзі проста пілі, елі і не думалі пра будучае, ды і прыстасаванцы-маркічы жылі толькі сённяшнім днём.

У аповесці некалькі разоў згадваецца вобраз-канцэпт „марцавых санетаў" або „сакавіцкіх санетаў". Так герой называў стан надвор'я напрадвесні, калі на адталую вясеннюю зямлю зноў падае снег. Гэтак пісьменнік сінанімічна ўзмацняе алегарычны сэнс назвы твора – як вясна наступае не адразу, а паступова, бо зіма неахвотна аддае сваё ўладаранне, так і таталітарныя дзяржаўныя амбіцыі вельмі неахвотна адступаюць перад новым светапоглядам, дапытлівай крытычнай думкай і мужнай жыццёвай пазіцыяй маладых, „новых людзей" савецкай краіны.

Асэнсоўваючы феномен Караткевіча з вышыні XXI стагоддзя, неабходна зазначыць, з якой дакладнасцю і вычарпальнасцю дваццацісямігадовы пісьменнік ужо ў першай аповесці выказаў сваё разуменне патрыятызму і яго адрозненне ад нацыяналізму. На той час сур'ёзнае абгрунтаванне патрыятычнай пазіцыі было вельмі актуальным, бо абаронцы старой, савецка-сталінскай ідэйнасці па-

[33] *Ibid.*, с. 10–20.
[34] *Ibid.*, с. 21.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

пракалі прыхільнікаў „вясны" ў нацыяналізме. Спрэчкі студэнтаў, герояў твора аб патрыятызме і нацыяналізме – гэта спрэчка пісьменніка з тагачаснай палітыка-ідэалагічнай выхаваўчай сістэмай, якая ўсімі магчымымі сродкамі намагалася стрымаць разняволенне інтэлектуальных сіл грамадства ў гуманітарна-дэмакратычным накірунку.

Для дасведчанага, удумлівага студэнта чацвертага курса беларуса Берасневіча, які любіць Украіну і Кіеў, сябруе з палякам, латышом і на ўсё жыццё пакахаў украінскую дзяўчыну, усё зразумела і проста: „Няхай ты хоць як хвалі сваю Радзіму, узнімай яе хоць да нябёс, – пакуль ты паважаеш другія народы, ты патрыёт. Напрыклад, Шаўчэнка і яго верш *Каўказ*… Вядома, мне сваё падабаецца больш чужога, і тут нічога дзіўнага няма. А некаторыя, – ледзь пахваліш сваё, – пачынаюць гвалт крычаць. Я лічу, што гэта глупства. Кожны народ робіць сваю справу і існуе для нейкай мэты на зямлі".[35]

Караткевіч праз сваіх герояў, найперш Берасневіча, выказвае непрыманне дагматызму, ідэалагічна абмежаванага разумення і кансерватыўнай інтэрпрэтацыі фундаментальных светапоглядна-філасофскіх, эстэтычных і этычных ідэй. Пісьменніка, несумненна, абурала і абражала, што абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці народаў вялікай шматнацыянальнай краіны выклікала „крымінальны сверб" у ахоўнікаў сістэмы, афіцыйных ідэолагаў. Герой Караткевіча не знаходзіць логікі ў савецкіх ацэнках многіх сацыякультурных з'яў: чаму, напрыклад, абуджэнне самасвядомасці ў Італіі пры Гарыбальдзі або на Русі пры Пушкіне – станоўчая з'ява, а абуджэнне беларускай самасвядомасці ў Лабановіча, героя трылогіі Я. Коласа *На ростанях*, – з'ява непажаданая, бо ўсё ж мае ў сабе „некаторую небяспеку". Ён звяртаецца да аўтарытэту Леніна, які, Берасневіч памятае дакладна, у 19-м томе пісаў, што абарона бацькаўшчыны – гэта абарона дэмакратыі, роднай мовы, палітычнай свабоды супраць сярэдневечча. Як бачым, малады філолаг-мысляр Караткевіч выступае сур'ёзным апанентам сістэме, якая вульгарызуе логіку гуманістычнага мыслення.

Змест, сэнс і падтэкст першай аповесці сведчаць, што Караткевіч, у многім нават апераджаючы агульнаграмадскія настроі, пераканана сцвярджаў ідэю-мару паўнацэннай рэалізацыі духоўна-творчага патэнцыялу свайго народа, сцвярджаў, што беларуская нацыянальна-культурная самарэалізацыя ніяк не замінае і не перашкаджае іншым народам, а з'яўляецца непаўторна-важным чыннікам узбагачэння сусветнай культуры, усяго чалавецтва. І гэта маніфестуецца праз выказванні галоўнага героя твора Уладзіслава Берасневіча: „Самасвядомасці гэтай у нас – ой як не хапае. Не ведаем ні мовы, ні гісторыі, ні фальклору […] А патрэбна, каб усе народы зрабілі ўсё, што магчыма, каб праз паўтары тысячы год людзі ўспаміналі: „Вось калісьці былі беларусы. Многа зрабілі, чэрці, для светавой культуры, не менш, ніж французы альбо рускія ці італьянцы".[36]

[35] *Ibid.*, с. 43.
[36] *Ibid.*, с. 44.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

„Залатая дарога некуды ў шчасце" маладому герою Караткевіча ўяўляецца выразна: радасная рамантычная будучыня з каханай Алёнкай і рупная праца для беларускага краю і народа, дзеля абуджэння і ўзбагачэння магутнага духоўна-творчага патэнцыялу беларусаў – „вечнае каханне і векавечная Бацькаўшчына"…

У беларускай літаратуры не знойдзецца аналагічных твораў, дзе б так выразна і сутнасна перадавалася атмасфера палітыка-ідэалагічнага кантролю за сістэмай універсітэцкай адукацыі перыяду ранняга постсталінізму. Побач з прафесурай, якая набліжала грамадскі прагрэс і рыхтавала студэнтаў, сваіх вучняў да самаахвярнага выканання асветна-гуманітарнай місіі, да новай будучыні, былі іншыя – ахоўнікі застарэлых догм марксісцка-ленінскай класава-рэвалюцыйнай філасофіі. Менавіта такія, як герой твора старшы выкладчык Холадаў, старанна ахоўвалі і абслугоўвалі палітыка-ідэалагічныя каноны таталітарнай савецкай дзяржавы, стрымлівалі і прыніжалі пазнавальныя і творчыя здольнасці студэнцкай моладзі. Па ацэнцы Уладзіслава і яго сяброў, Холадаў быў „вялікі зух і, на жаль, вялікі фармаліст".[37] Ён замяняў разумнага і прыязнага да студэнтаў выкладчыка Маркевіча, які пэўны час хварэў. Заняткі Холадава для начытаных і дапытлівых студэнтаў былі:

„[…] нуднымі, як дажджлівы панядзелак. Форма стала галоўным, слова стала галоўным, а на сэнс забыліся нават лепшыя студэнты, тым больш, што Холадаў і сам не вельмі працаваў галавою, ужываючы толькі зазубранае «адсюль – дасюль». Яго і не слухалі […] На задніх лаўках бегалі ў руках у некаторых студэнтак не аўтаручкі, а пруткі, хлопцы гулялі ў «марскі бой» […] Той-сёй чытаў […].

Нельга было толькі не хадзіць на лекцыі і семінары, выказваць самастойныя думкі, спрачацца і адказваць «сваімі словамі» У гэтых выпадках лектар заўсёды пачынаў хрыпець і наліваццa крывёй".[38]

Пра тое, што інтэлектуальна-гуманістычны прагрэс грамадства, нягледзячы на намаганні, кантроль і пагрозы артадоксаў, спыніць ужо немагчыма сведчаць, трапныя іранічныя мянушкі, якімі надзялялі студэнты такіх выкладчыкаў – „Балалайкін нашага часу", „хадзячая догма", „ваяўнічы ілжэчалавек" і інш.

Для спасціжэння канцэптуальнай праблематыкі твора праз аблічча галоўнага героя, дапытлівага інтэлектуала, які мае рашучасць супрацьстаяць дагматызацыі ўніверсітэцкага жыцця, важнае значэнне маюць эпізоды твора, дзе апісваюцца заняткі студэнтаў са старшым выкладчыкам Холадавым. Так, аднойчы на семінары, дзе абмяркоўвалася „магчымасць перамогі сацыялізма і камунізма ў адной краіне", Берасневіч дазволіў сабе спаслацца на выснову Энгельса аб тым, што перамога сацыялізма ў адной краіне немагчыма. Але гэта пярэчыла тагачаснай савецкай марксісцкай навуцы. Выкладчык Холадаў груба перапыніў студэнта:

[37] *Ibid.*, с. 49.
[38] *Ibidem*.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

„Не трэба залішне думаць. З Энгельсам усё адно вам не зраўняцца […] Хіба ў Энгельса маглі быць памылкі!!!".[39]

Выкладчык-дагматык сваім тонам гаворкі, абразлівым каментарам прыніжае студэнта, прымушае Берасневіча прызнаць памылковасць свайго выказвання і нават некалькі разоў публічна папрасіць прабачэння. І гэта яшчэ не ўсё: Холадаў у парыве гневу на адукаванага студэнта патрабуе, каб Уладзіслаў пакінуў аўдыторыю, але той годна адказвае на абразы: „Не крычыце на мяне! На мяне яшчэ ніхто не крычаў. Я не хлопчык, я адказваю за свае ўчынкі. Я не шчанюк, каб мяне выкідвалі за шкірку без усякай маёй віны".[40]

Канфлікт між выкладчыкам і студэнтам у творы шматзначны і шматмерны: гэта не проста канфлікт пакаленняў, старога дагматызму з новым мысленнем і гуманістычным светаразуменнем. Пазіцыя Берасневіча – гэта яшчэ і выклік сілам, якія намагаюцца стрымаць непазбежны філасофска-дэмакратычны прагрэс грамадства, гэта супрацьстаянне „вясны" і „зімы".

Далейшыя падзеі ў творы прадказальныя: ідэалагічна-ахоўныя сілы сістэмы (холадавы і маркічы) кансалідаваліся супраць „недаравальнай" самастойнасці Берасневіча, які, да таго ж, замест камсамольскага сходу можа пасля заняткаў пайсці са сваёй Алёнкай слухаць сімфанічны аркестр ці ў музей. Камсамольскае бюро рыхтуе сход на тэму „Паводзіны сапраўднага камсамольца", апісанне якога ў сюжэтнай структуры твора ўяўляецца кульмінацыйнай вяршыняй канфлікту. Маркіч на камсамольскім сходзе, дзе прысутнічаюць усе студэнты і некаторыя выкладчыкі факультэта, публічна звяртаецца да Берасневіча „вельмі і вельмі падумаць пра свае паводзіны", калі той хоча „застацца другам сапраўдных савецкіх маладых людзей".[41] Сход ператварыўся ў гарачую спрэчку, бо сябры і многія выкладчыкі ведалі і цанілі Уладзіслава як лепшага студэнта, які і сам раней быў добрым камсоргам, працаваў і вучыўся, даючы прыклад іншым, удзельнічаў у навуковых гуртках, яму належыць ідэя – пабудаваць універсітэцкі стадыён.

Камсамольскі сход на факультэце – гэта дакладная мініяцюра ідэалагічнага жыцця ў савецкім грамадстве, а па-сутнасці цынічная расправа над самастойнасцю мыслення, над тымі, хто дазваляе сабе выказваць сумненні і прынцыповыя меркаванні, якія адрозніваюцца ад афіцыйных. Апісаны Караткевічам сход камсамольцаў вельмі нагадвае партыйныя сходы па „чыстцы" канца 20-х і 30-х гадоў, калі публічнае выключэнне з партыі азначала суровы прысуд, а „вычышчаны" станавіўся ахвярай сталінскіх рэпрэсій.

Маркіч і яго актывісты на сходзе шальмуюць Берасневіча, прад'яўляючы яму сур'ёзныя „антысавецкія" абвінавачванні: у нацыяналізме, у апраўданні буржуазнага нацыяналізму, у крытычных выказваннях аб сучаснай нацыянальнай палітыцы, у паклёпе на сістэму выхавання савецкіх людзей, у пагардзе да

[39] *Ibid.*, с. 50–51.
[40] *Ibid.*, с. 52.
[41] *Ibid.*, с. 72.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

марксісцкай філасофіі („чытае Ніцшэ і, відаць, бярэ з яго рэакцыйнай філасофіі многае"), у нежаданні вывучаць марксізм… Ну, сапраўды, чым не „замаскіраваны вораг народа", якіх два дзесяцігоддзі назад расстрэльвалі або высылалі.

Не Уладзіславу, а абвінаваўцам паверыла і Алёнка, назваўшы яго „ілгуном", хоць насамрэч цынічным ілгуном быў Маркіч. Моцны і годны чалавек, Берасневіч не палічыў патрэбным шматслоўна апраўдвацца, абараняцца ад гвалтоўнай маны і несправядлівасці. Сябры Берасневіча, Паўлюк і Янка, абараняюць яго ад хлуслівых паклёпніцкіх нападак, не пагаджаюцца з прапановай камсамольскай актывісткі Марыі Капасевіч выключыць Уладзіслава з камсамола і ўніверсітэта.

Апісанне сходу выяўляе важнае і глыбокае сэнсава-ідэалагічнае гучанне ўсяго твора, у канцэптуальнай аснове якога ляжыць ідэйнае і маральна-этычнае супрацьстаянне Берасневіча Маркічу, гэта значыць, новага, дэмакрытычнага – старому, таталітарнаму. Выступленне і заступніцтва на сходзе Янкі Галаўні, які быў не проста сябрам Уладзіслава, але і камуністам ужо чатыры гады, выкрывае хлусню Маркіча. Аднак, у выніку, Берасневіч не змог пайсці, як планавалася раней, адразу пасля ўніверсітэта ў аспірантуру. Ён вырашае пакінуць вучобу і паехаць на працу ў вясковую школу. Мужны хлопец справядліва папракае камсамольскі сход, што даў волю несумленнаму Маркічу: „Я не забуду толькі аднаго: вы сёння маўчалі, некаторыя проста не спрачаліся, хоць ведалі – робіцца несправядлівасць. Вы дрэнна зрабілі, хлопцы, мне сорамна за вас".[42]

Выказваннямі свайго героя Караткевіч асуджае маўклівае грамадскае згодніцтва, пасіўную абыякавасць, душэўную ляноту і заспакоенасць, якія ва ўсе часы мяжуюць са здрадніцтвам, адступніцтвам. Асобныя эпізоды сходу, як і апісанне яго ў цэлым, – ідэйна-вызначальныя старонкі аповесці.

У гэтым творы пісьменнік дакладна высвеціў праявы сапраўднага сяброўства, маральна-этычныя складнікі таварышавання ў студэнцкім калектыве ў сітуацыі, калі сход ператвараецца ў расправу над вальнадумствам. Аўтар паказвае, як лёгка можна схібіць, здрадзіць, калі ў маладога чалавека няма трывалай маральнай, духоўнай асновы. У гэтым плане красамоўным з'яўляецца вобраз Рыгора Сяляўкі. Пад уплывам шчырага і прынцыповага Берасневіча Сяляўка пераадольвае „маркічаўшчыну". На сходзе Маркіч патрабаваў, каб Сяляўка засведчыў нібыта „шкодніцтва" Уладзіслава. Рыгор не вытрымлівае больш гвалту Маркіча, яму брыдка быць ілжэсведкам супраць добрага, сумленнага таварыша. Дамаганні Маркіча выбухаюць у душы да гэтага часу, здавалася б, беспрынцыпнага, запалоханага хлопца, нечакана для ўсіх, сапраўднай бурай пратэсту супраць камсамольскага „важака": „Падла ты, злодзей! – нечакана загрымеў, несамавіта закрычаў Сяляўка [выдзелена намі – З. М.], адразу пераходзячы на віцебскі дыялект […] – Нашто топіш добрага чалавека, дрэнь?!?".[43]

[42] *Ibid.*, с. 85.
[43] *Ibid.*, с. 79.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

Ранейшыя паводзіны Рыгора Сяляўкі, і яго сапраўдны ўчынак на сходзе – таксама канцэптуальна важны матыў у спасціжэнні паўнаты ідэйнага і маральна-этычнага гучання твора: „выпростваецца" звычайны, „сярэдні" чалавек, якога да гэтага выпадку многія лічылі „прыліпалам", у якога, лічылася, не было ўласных меркаванняў. Яго цярплівае маўчанне закончылася рашучым абурэннем, пратэстам супраць ханжаства і кар'ерызму („Няма чаго… мне маўчаць!"). І гэта думка пераканаўча і дакладна падкрэслена аўтарам сінанімічнымі экспрэсіўнымі выказнікамі („нечакана загрымеў", „несамавіта закрычаў"), з заўвагай аўтара аб пераходзе героя на родную гаворку.

Несумненна, што правамерна інтэрпрэтаваць паводзіны гэтага героя як сімптом і знак непазбежнай дэмакратызацыі жыцця, як прадвесце „вясны" вызвалення духоўных сіл запалоханага шараговага чалавека. Акрамя таго, аўтар адначасова ўздымае праблему лідэрства ў маладзёжным калектыве – сапраўднага і афіцыйнага: за Берасневічам – патэнцыял духоўнасці, маральнасці, абнаўлення; за Маркічам – учарашні дзень з ідэалагічнымі забаронамі, шантажом маўклівых і рахманых. Калі пасля сходу Сяляўка падышоў з прабачэннямі за мінулае, Берасневіч, без папрокаў і павучанняў, па-сапраўднаму падтрымаў слабейшага духам: „Нічога, нічога, хлопча. Ты добры сябра. Толькі рабіся цвёрдым. Сёння яны ледзь не зацягнулі цябе на ўчынак, якога ты мог бы саромецца ўсё жыццё".[44]. За апісаннем сходу, спрэчак, выказванняў герояў выразна ўяўляецца ідэалагічная размежаванасць тагачаснага савецкага грамадства.

Самая вялікая і самая балючая здрада – здрада блізкіх, самых дарагіх людзей. Сюжэтная лінія кахання Уладзіслава і Алёнкі разгортваецца ў аповесці даволі традыцыйна: дзяўчына засумнявалася ў „камсамольскіх" якасцях каханага, паверыла Маркічу, які даўно марыў аб заляцанні да эстэтычна-вытанчанай, прыгожай, да таго ж і таленавітай студэнткі-спявачкі. Пасля сходу дзяўчына пазбягала сустрэч і размоў з Уладзіславам, яе бачылі ў горадзе з Маркічам, за што сябры Берасневіча і назвалі яе „флюгерам у сукенцы". Маркіч пераканаў дзяўчыну, што Уладзіслаў „контррэвалюцыянер", што „дрэнна скончыць" і што „гэта будзе хутка".[45]

Гераіня па-свойму перажывае драматызм расчаравання ў каханым. Праз чатыры гады, пасля сустрэчы з Уладзіславам, яна пакутліва перажывае і драматызм пакаяння і апраўдання перад ім. Праз думкі і адчуванні гераіні аўтар параўноўвае тагачаснае грамадскае жыццё з „віруючым катлом", у які траплялі сумленныя, непавінныя людзі. Праўда, здрада праўдзе, „папсаваная праўда", ратаванне праўды – развагі гераіні аб гэтым адпавядаюць абвостранаму абмеркаванню ў тагачасным грамадстве ідэі праўдзівасці і сумленнасці ва ўсіх сферах жыцця.

Галоўны герой гэтага твора Караткевіча Уладзіслаў Берасневіч, як і героі многіх наступных твораў розных жанраў, непахісны як у сваіх перакананнях, так і ў каханні. Ён здольны на моцнае пачуццё, якое „нішто не затопіць і не зніш-

[44] *Ibid.*, с. 85.
[45] *Ibid.*, с. 90.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

чыць”.[46] Пачуцці закаханых герояў гэтага твора праходзяць выпрабаванні часам і невядомасцю. Нечаканая сустрэча, якая адбываецца праз чатыры гады ростані, дае спадзяванне на аднаўленне сапраўднага пачуцця. Невыпадкова маладыя героі Караткевіча, Уладзіслаў і Алёнка, зноў сустракаюцца менавіта напрадвесні: заканчвалася зіма – заканчвалася і чатырохгадовая ростань. Апошні снег пахнуў Берасневічу будучай вясной, якая драмала ў снягах.

Малады Караткевіч праз драматычны духоўны вопыт свайго героя Берасневіча вельмі пераканаўча перадаў атмасферу грамадскай хлусні, цынізму і вераломнасці сістэмы, якая хоча і далей, як было дагэтуль у эпоху таталітарызму, ад імя народа ламаць лёсы носьбітаў іншадумства, у дадзеным выпадку хаваючы сваю сутнасць за ідэалагічнай камсамольскай рыторыкай. Каб выстаяць перад гвалтам, трэба было заставацца нязломным; маральна і духоўна слабейшых чакаў лёс ахвяр. Вось красамоўны роздум аб гэтым героя Караткевіча: „Самым жахлівым было тое, што ўсё гэта рабілася вонкава зусім прыстойна і натуральна, рабілася камсамольскім імем […] І што магчыма было зрабіць супраць гэтага, раз нягоднікі атаясамлівалі сябе з камсамолам, крычалі прыгожыя словы, а былі гадкімі і склізкімі ў сваім ханжастве, як уюны? Лайся – зробяць з цябе хулігана, біся – зробяць злачынцам […] І як усякае ханжаства, маркічаўшчыну нельга, вельмі цяжка схапіць за рукую Яна перафарбуецца, яна самую лепшую, самую светлую мэту зробіць сродкам для кар’еры, яна ніколі не ўступіць у камсамол, калі гэта небяспечна […], але яна затое будзе галасней за ўсіх лемантаваць на зборах [сходах – З.М.], калі небяспека мінe. Вось і зараз яна зрабіла такое яму, чалавеку, які жадаў для любімай справы яшчэ больш праўды і магутнасці, для якога палова жыцця была ў гэтай пашарпанай, непрыгожай шэрай кніжачцы, што ляжала ў яго ў кішэні”.[47]

Праз гэтага героя перададзена вера самога аўтара ў высокія ідэалы, паводле якіх павінна жыць савецкае грамадства. Герой шукае спосабы доказу праўды і справядлівасці. Ён адкідвае думкі аб самазабойстве, бо яго смерць толькі дасць таемную радасць маркічам, і замест жыцця будзе цемра – без надзеі змагання, „не будзе сонца і Алёнкі, не будзе камуны, да якой ён збіраўся дажыць”.[48] Берасневіч знаходзіць іншы шлях барацьбы з маркічамі – ён піша ліст у ЦК камсамола, у якім распавядае пра балючыя падзеі, не шкадуючы сябе, але і Маркіча. Героя Караткевіча не пакідае вера ў справядлівасць. І менавіта гэтая вера, падтрымка сапраўдных сяброў робяць героя яшчэ мацнейшым і яшчэ больш перакананым у перамозе сумленнасці, у супрацьстаянні амаральнай дэмагогіі.

Вобраз Берасневіча – увасабленне „новага” грамадзянскага і філасофскага мыслення. За абліччам героя стаіць бунтарная асоба самога аўтара, які шчыра верыў у канчатковае дэмакратычнае абнаўленне грамадства: „Берасневіч адчу-

[46] *Ibid.*, с. 121.
[47] *Ibid.*, с. 87–88.
[48] *Ibid.*, с. 92.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

ваў, […] што робіцца яго справа і сама дзяржава робіцца ўсё больш і больш роднай яму, без ранейшых непаразуменняў […]".[49]. Праз духоўны вопыт і драматызм перажытага героем Караткевіч сцвярджаў: чалавек павінен быць не ахвярай, а змагаром; хто не паважае сябе, той не паважае па-сапраўднаму і іншых; слабы, безабаронны чалавек ва ўмовах гвалту ператвараецца ў ахвяру ці прыстасаванца – бязвольную істоту, якой лёгка маніпулююць дэмагогі, ілжэлідэры: яны прымушаюць пакорных лічыць сваё кіраванне ласкай, „адказнай місіяй".

Як бачна, ужо ў першай аповесці Караткевіч закранае сэнсавае напаўненне важных светапоглядных паняццяў: гуманістычнага (выраз „абстрактны гуманізм" у той час меў асуджальнае значэнне, супрацьлеглае класаваму, „савецкаму" гуманізму), нацыянальнага, патрыятычнага, духоўнага, справядлівага, гістарызма мыслення, якія вульгарызаваліся ідэолагамі-дагматыкамі. Аўтар смела заяўляў аб прафанацыі высокіх ідэйных і духоўных катэгорый у тагачасным савецкім грамадстве. Несумненна, што праблемы духоўнага росту асобы і дэмакратычнага, цывілізацыйнага развіцця грамадства былі найважнейшымі для Караткевіча ўжо ў той час, у другой палове 50-х гадоў XX стагоддзя.

* * *

Мы жывём у тэхнакратычны час, калі не цалкам запатрабаваны сцверджаныя Караткевічам, ранейшымі і пазнейшымі класікамі, усёй беларускай літаратурай, нацыянальныя, духоўныя каштоўнасці. Яны страчваюцца ў сувязі з вельмі абмежаваным функцыянаваннем нацыянальнай мовы, абмежаваным вывучэннем нацыянальнай літаратуры, гісторыі найперш у агульнаадукацыйнай, а затым і ва ўніверсітэцкай сферах. Па гэтай прычыне са светапогляду, з выхавання грамадзянскасці, патрыятызму сучасных пакаленняў выцясняецца нацыякультурны, нацыягістарычны код, носьбітамі якога і з'яўляюцца родная мова, літаратура, гісторыя, якім ахвярна, па-рыцарску служылі волаты, тытаны нацыі, сярод якіх і Караткевіч.

Са шкадаваннем даводзіцца канстатаваць, што ў многіх сучасных творцаў знікла „караткевічаўскае" пачуццё асабістай адказнасці мастака за свае творы і за сваю нацыю, якая, па вялых песімістычных прагнозах сённяшніх постмадэрністаў, непазбежна павінна выradзіцца. Але ў нас, жыхароў эпохі ўсемагутнага стандарта, жыве і не хоча паміраць беларуская душа і беларуская свядомасць. І дапамагае ў гэтым Беларусі Караткевіч, які ў сваёй творчасці пераканаўча абгрунтаваў этычны генатып нашай нацыі. Пісьменнік і філосаф у адной асобе, Караткевіч слушна і бліскуча даводзіў, што нацыянальнае – гэта пазачасавы каштоўнасны код кожнага народа. Менавіта на гэта і павінна арыентавацца самае сучаснае і цывілізаванае грамадства.

[49] *Ibid.*, с. 104.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 14:08:51

Summary

The paper discusses the evolution of philosophical aesthetic views of the eminent mid-20th century Belarusian writer Uladzimir Karatkievich. Special emphasis has been placed on the impact of the 1960s ideology and the Khrushchev Thaw, and on the importance of the Kiev period in the life of the young writer when he was a student at the Taras Shevchenko University in Kiev. The author concludes that it was in Kiev in the 1950s that the Belarusian genius chose his creative path. The article closely analyses Karatkievich's first important work: the novel In snow sleeps the spring, which can be safely called the manifesto of the "philological" generation in Belarusian 20th-century literature.